Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 293 (362)
СУБОТА
21
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

УЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЛЕСАВЫВАЗКІ

Лес мае велізарнае значэнне ў нашай народнай гаспадарцы. Лес патрэбен для дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, для абароны нашай вялікай радзімы. Ад бесперабойнай работы лясной прамысловасці ў значнай меры залежыць планамерная работа дрэваапрацоўчых і іншых прадпрыемстваў.

Партыя і ўрад удзяляюць велізарную ўвагу выкананню планаў лесазагатовак і лесавывазкі. Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб паляпшэнні работы лесазагатоўчай прамысловасці прадугледжвае перабудову сістэмы зарплаты лесарубаў і возчыкаў, стварэнне адпаведнага стымулу ў рабоце. Так, напрыклад, лесаруб, выканаўшы за сезон больш 60 процантаў норм выпрацоўкі, атрымлівае за перавыкананую частку выпрацоўкі звыш 60 норм і да 80 норм прэмію-надбаўку ў размеры 120 процантаў асноўнай зарплаты. Прэміі-надбаўкі ўстаноўлены і для іншых рабочых лесазагатоўчай прамысловасці — для тральшчыкаў і грузчыкаў. Упарадкаваны дагаворныя ўзаемаадносіны з сялянамі. Створаны ўсе ўмовы для выканання плана лесазагатовак і лесавывазкі.

Не гледзячы на гэта, лесазагатоўчая прамысловасць нашай вобласці працягвае адставаць. На 15 снежня план лесазагатовак па вобласці выканан усяго на 26,5 процанта. Кіраўнікі лесазагатоўчай арганізацыі «Беластоклеспром» не забяспечваюць выканання плана. Не гледзячы на рад рашэнняў абкома партыі, кіраўнікі трэста праяўляюць непаваротлівасць і безыніцыятыўнасць.

Прыкладам дрэннай работы можа служыць Беластоцкі леспрамгас, які з месяца ў месяц не выконвае сваю праграму. Да 15 снежня квартальны план лесавывазкі па гэтаму леспрамгасу выканан усяго на 25 процантаў. Не большы процант даў леспрамгас і па загатоўцы. Некаторыя лесаўчасткі гэтага леспрамгаса (Валілы, Супрасль) даюць яшчэ меншыя паказчыкі. Нават такі лесаўчастак, як Чорная Весь, які мае добра абсталяваную вузкакалейную чыгунку, выканаў усяго палову квартальнага задання.

Дзе прычыны такой нездавальняючай работы? Па-першае, у адсутнасці аператыўнага кіраўніцтва лесазагатоўкамі і лесавывазкамі з боку дырэкцыі трэста і леспрамгасаў. Па-другое, у ігнарыраванні ўдасканаленага інструмента—лучковай пілы і пілы «Краскот». Не могуць у Беластоцкім і іншых леспрамгасах пахваліцца вырашчанымі кадрамі лучкістаў, людзьмі, якія ў дакладнасці валодаюць лучковай пілой.

Не лепш абстаіць справа і з лесавывазкай. План па трэсту выканан усяго на 20,4 процанта. На Катрынскі лесаўчастак Беластоцкага леспрамгаса штодзённа павінна выходзіць да 2 тысяч падвод. 17 і 18 снежня не выйшла ні адной падводы. Трэба адзначыць, што на тых лесаўчастках, дзе выхад падвод ёсць, справы таксама не бліскучыя, бо надта нізкая прадукцыйнасць працы. Днямі 73 падводы з Агароднікаўскага сельсовета, Заблудаўскага раёна, вывезлі 54 кубаметры драўніны, не выканаўшы, такім чынам, і паловы нормы. 98 падвод з Рыбольскага сельсовета вывезлі 69 кубаметраў лесу. Гэтыя прыклады далёка не адзінкавыя. Прычына заключаецца ў тым, што сяляне трацяць больш часу на раз'езды ў лес і з лесу дамоў і вельмі мала працуюць непасрэдна ў лесе. Не створаны яшчэ ўмовы, каб селянін змог працаваць у лесе некалькі дзён падрад.

Там, дзе работа ў лесе лепш арганізавана, там сяляне-возчыкі значна перавыконваюць нормы. Напрыклад, 14 возчыкаў з вёскі Порасль Бацечкаўскага сельсовета, вывезлі 105,5 кубаметра лесу, выканаўшы заданне на 200 процантаў.

У нездавальняючай рабоце лесазагатоўчай прамысловасці вінаваты і многія раённыя кіруючыя арганізацыі, якія не змагаюцца па-большэвіцку за выкананне лесазагатовак і лесавывазкі. Многія раёны нашай вобласці да гэтага часу па-сапраўднаму не ўзяліся за выкананне дзяржаўнага плана лесавывазкі. Па Гродненскаму раёну план выканан толькі на 18 процантаў, па Дамброўскаму — на 13 процантаў, Заблудаўскаму — на 13 процантаў. Яшчэ горш працуюць Сапоцкінскі, Бельскі і іншыя раёны.

Многія лесарубы нашай вобласці горача адгукнуліся на заклік стаўбцоўскіх лесарубаў аб шырокім разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне квартальнага плана лесазагатовак і лесавывазкі. У гэтым спаборніцтве асобныя лесарубы і брыгады нашых леспрамгасаў ужо дабіліся нядрэнных паказчыкаў. Такія лесарубы, як Врублеўскі (Саколкаўскі леспрамгас), Вайтукевіч і Песцюк (Гродненскі леспрамгас) і іншыя ў некалькі разоў перакрываюць нормы выпрацоўкі. Аднак вопыт перадавых людзей не стаў здабыткам усіх лесарубаў і возчыкаў нашай вобласці.

Учора ў друку было апублікавана паведамленне аб скліканні XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Канферэнцыя будзе абмяркоўваць пытанне аб рабоце партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта. Доўг чэсці кожнага кіраўніка, кожнага працоўнага—сустрэць гэту знамянальную дату новымі поспехамі ў прамысловасці, на транспарце, ва ўсіх галінах нашай народнай гаспадаркі. Работнікі лесазагатоўчай прамысловасці павінны прыкласці ўсе сілы к таму, каб забяспечыць поўнае выкананне плана.

Прывітанне ад тав. Ракошы

КАЛЕКТЫВУ ТРЭЦЯГА КАМБІНАТА

Калі вядомы венгерскі рэволюцыянер М. Ракошы быў вызвален з турмы, калектыў 3-га тэкстыльнага камбіната паслаў прывітанне мужнаму рэволюцыянеру.

Днямі на імя камітэта МОПР'а 3-га камбіната атрымана пісьмо ад тав. Ракошы, у якім ён піша:

«Дарагія таварышы! Сардэчна дзякую за прывітанне. Спадзяюся, следуючы вашым пажаданням, у бліжэйшы час зноў прыступіць да работы.

Дзякуючы сталінскай палітыцы міру вы сталі свабоднымі грамадзянамі свабоднай краіны. Іменна таму вы павінны высока трымаць сцяг інтэрнацыянальнай салідарнасці і памятаць аб сваіх братах па класу, якія томяцца ў засценках капітала.

Мацуйце работу МОПР'а.

З мопраўскім прывітаннем

Ваш М. І. Ракошы».

У барацьбе за датэрміновае выкананне гадавога плана

Калектыў трэцяга тэкстыльнага камбіната ў соцыялістычным спаборніцтве на дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных дабіўся нядрэнных паказчыкаў. Калектыў камбіната змагаецца цяпер за замацаванне дасягнутых паказчыкаў, за датэрміновае выкананне гадавога плана. Значных поспехаў дабіўся калектыў прадзільнага цэха. З усяго саставу рабочых-прадзільшчыкаў 88 процантаў рабочых асвоілі норму выпрацоўкі.

Сваёй прыкладнай стаханаўскай работай вызначаюцца прадзільшчыцы Паплаўская і Зелянкевіч, якія выконваюць план на 115 процантаў. Яны працуюць на ўшчыльнёнай рабоце. Сярод ткачоў ужо ёсць чатырохстаночнікі. Нядаўна тав. Ткач перайшоў на абслугоўванне чатырох ткацкіх станкоў. Яго зменшчыкам працуе тав. Леў. Чатырохстаночнікі выконваюць нормы на 107 — 108 процантаў.

Калектыў рабочых трэцяга тэкстыльнага камбіната абавязаўся замацаваць дасягнутыя поспехі і датэрмінова выканаць гадавы план.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР

Прэзідыумам Вярхоўнага Совета Беларускай ССР атрыманы ад выбарчых камісій па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных наступныя даныя аб рэзультатах галасавання:

Па Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях — у абласныя Советы з 2.904.552 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 2.893.614 чалавек, што складае 99,62 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.865.068 чалавек, што складае 99,01 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР» аказалася 729.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў — 27.817.

Па ўсіх выбарчых акругах у абласныя Советы выбрана 367 дэпутатаў, з іх: мужчын — 285, жанчын — 82; комуністаў — 183, беспартыйных — 184.

Па 98 раёнах — у раённыя Советы з 2.582.656 выбаршчыкаў прыняла ўдзел у галасаванні 2.574.380 чалавек, што складае 99,68 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.540.969 чалавек, што складае 98,70 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі, згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР» аказалася 913.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў, — 32.498.

Па ўсіх выбарчых акругах у раённыя Советы выбрана 4.243 дэпутаты, з іх: мужчын — 3.163, жанчын — 1.080; комуністаў — 1.800, беспартыйных — 2.443.

Па 43 гарадах — у гарадскія Советы з 579.759 выбаршчыкаў прыняла ўдзел у галасаванні 576,914, што складае 99,51 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 570.282 чалавекі, што складае 98,85 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі, згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР» аказалася 119.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў, — 6.513.

Па ўсіх выбарчых акругах у гарадскія Советы выбрана 2.519 дэпутатаў, з іх: мужчын — 1.885, жанчын — 634; комуністаў — 886, беспартыйных — 1.633.

Па 1.473 сельсоветах і пасёлках — у сельскія і пасялковыя Советы з 2.328.717 выбаршчыкаў прыняла ўдзел у галасаванні — 2.322.305 чалавек, што складае 99,72 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.275.454 чалавекі, што складае 97,98 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі, згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР» аказалася 901.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў, — 45.950.

Па ўсіх выбарчых акругах у сельскія і пасялковыя Советы выбрана 32.945 дэпутатаў, з іх: мужчын — 25.671, жанчын — 7.274; комуністаў — 454, беспартыйных — 32.491.

Па ўсіх акругах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных выбраны кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных.

Два кандыдаты, якія балатыраваліся па двух выбарчых акругах па выбарах у сельскія Советы, атрымалі менш палавіны ўсіх галасоў, паданых па акрузе, і таму, згодна артыкула 118 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР» аказаліся не выбранымі. У адпаведнасці з артыкулам 118 «Палажэння аб выбарах» у гэтых двух выбарчых акругах назначаюцца новыя выбары.

ЗАМАЦУЕМ ВЫТВОРЧЫЯ ПОСПЕХІ, ДАСЯГНУТЫЯ Ў ЧАС ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

НА ДАСЯГНУТЫМ НЕ СПЫНІМСЯ

На працягу ўсяго 1940 года цвіковы завод № 2 лічыўся адстаючым прадпрыемствам. Вытворчая праграма не выконвалася. Завод працаваў толькі ў адну змену, у той час, калі план быў вызначан з разліку двухзменнай работы. Большасць рабочых не выконвалі норм выпрацоўкі, адсутнічаў учот і кантроль за выпускаемай прадукцыяй.

У свой час газета «Вольная праца» звярнула ўвагу грамадскасці на ненармальнасці, якія мелі месца на заводзе. У чацвертым квартале калектыў нашага завода дабіўся значных поспехаў. Праграма кастрычніка выканана на 111 процантаў, снежаньская таксама будзе выканана.

Дасягнутыя поспехі мы атрымалі шляхам укамплектавання другой змены, асваення норм выпрацоўкі асноўнай масай рабочых. Многія рабочыя на вытворчых нарадах узялі на сябе абавязацельства перавыканаць праграму чацвертага квартала і 1941 год сустрэць новымі вытворчымі поспехамі. Асобныя брыгады і цэхі дабіліся высокай прадукцыйнасці працы. Змена майстра тав. Фалькоўскага Станіслава штодзённа выконвае свой план на 115 процантаў. Брыгада кавалёў тт. Рашотка, Поль, Рыдзеўскі, Селігман сістэматычна выконвае заданне на 200 процантаў. Кавалі ручной коўкі тт. Казёл і Лупінскі выконваюць норму на 200 — 250 процантаў.

Лепшых поспехаў у такарным цэху дабіўся рабочы тав. Давідоўскі, які сістэматычна дае па паўтары нормы. Яго прыкладу следуюць токары Гайніцкі і Рацкі, даючыя таксама па дзве нормы. Зусім нядаўна прышоў на завод малады токар тав. Осеннік, але штодзённа выконвае план на 180 — 200 процантаў. Нарэзчыкі тт. Духноўскі, Рэзнік і Касінскі даюць па тры нормы.

Напярэдадні дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных наш калектыў стаў на стаханаўскую вахту. Дзённую праграму ён выканаў па таварнай прадукцыі на 102 процанты, па валавой — на 134 процанты. У гэты дзень многія рабочыя дабіліся добрых вынікаў. Рабочы Духноўскі выканаў праграму на 330 процантаў, Касінскі і Давідоўскі — на 300, Ганіцкі—на 249. Брыгада кавалёў, у якой працуюць тт. Рашотка, Поль і іншыя, далі па 247 процантаў.

Наш калектыў прыкладзе ўсе намаганні, каб дабіцца новых вытворчых поспехаў.

А. Сярэбранікаў,
дырэктар цвіковага завода № 2.

У Валкавыскіх вагоннікаў

Гістарычны дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных вагоннікі Валкавыскага ўчастка сустрэлі значнымі вытворчымі поспехамі. Старшыя аглядчыкі тт. Дамнічоў і Гарбачыкаў узялі абавязацельства да 15 снежня закончыць месячнае заданне па гадавому агляду вагонаў, давесці да нуля астатак сапсаваных вагонаў і інш.

Свае слова стаханаўцы-вагоннікі стрымалі. Калектыў змены тав. Дамнічова месячны план гадавога агляду да 13 снежня выканаў на 90 процантаў. Акрамя таго работнікі змены адрамантавалі на пуцях станцыі без падачы ў дэпо 36 вагонаў.

У спаборніцтве з зменай Дамнічова выдатных поспехаў дабіліся вагоннікі змены тав. Гарбачыкава тт. Сакалоўскі, Дэліч, Бабіч, Пашкоўскі і іншыя. Праграму гадавога агляду вагонаў яго змена выканала яшчэ 13 снежня на 93 процанты.

Валкавыскія вагоннікі далі слова замацаваць дасягнутыя поспехі і дабіцца яшчэ лепшых паказчыкаў.

А. Кандрацьеў.

Замацоўваюць дасягнутыя поспехі

Беластоцкі чыгуналіцейны завод яшчэ ў лістападзе выканаў гадавую вытворчую праграму. Рыхтуючыся дастойна сустрэць выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, калектыў завода дабіўся добрых паказчыкаў. І цяпер, пасля выбараў, калектыў змагаецца за замацаванне дасягнутых поспехаў.

На 15 снежня гадавая праграма заводам выканана на 115 процантаў. Многія рабочыя дасягнулі выдатных вынікаў у сваёй рабоце. Дэпутат горсовета ліцейшчык Станіслаў Дайліда выконвае план на 254 процанты, яго бацька Міхаіл Дайліда—на 150 процантаў. Стары рабочы Варвас, які звыш 30 год працуе на вытворчасці, выконвае план на 200 процантаў. Пасля прыходу Чырвонай Арміі на завод прышоў Цудоўскі. Ён не меў ніякай кваліфікацыі. Цяпер ён абучыўся ліцейнай справе і выконвае норму выпрацоўкі на 145 процантаў.

Ю. Ісаенка,
тэхнарук чыгуналіцейнага завода.

Па Совецкай краіне

УНІВЕРСАЛЬНЫ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ СТАНОК

БЕЛАМОРСК, Карэла-Фінская ССР. Майстар лесазавода № 2 Глазачоў І. сканструіраваў універсальны дрэваапрацоўчы станок, на якім можна выконваць амаль усе работы па дрэву. На станку канструкцыі тав. Глазачова можна пілiць, стругаць і даўбіць. На ім можна праводзіць розныя такарныя работы.

Майстар Глазачоў—аўтар некалькіх рацыяналізатарскіх вынаходніцкіх прапаноў.

ЗАКРЫЛАСЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ ПРЫБАЛТЫКІ

МАСКВА. 18 снежня закончылася нарада работнікаў мастацтваў Латвіі, Літвы і Эстоніі, склікапая Камітэтам па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР. За 10 дзён работнікі мастацтваў совецкай Прыбалтыкі азнаёміліся з творчай работай буйнейшых тэатраў, дзейнасцю музеяў і канцэртных арганізацый, мелі рад сустрэч з майстрамі мастацтваў сталіцы.

ЭЛЕКТРАЛЯЧЭННЕ НА СЯЛЕ

ВАРОНЕЖ. Варонежскі інстытут фізічных метадаў лячэння паспяхова праводзіць электралячэнне ў сельскіх раёнах, дзе няма электрастанцый. Уся партатыўная апаратура, рухавік і дынама змяшчаюцца на аўтамашыне.

На працягу 7 месяцаў гэта своеасаблівая медыцынская перасоўка пабывала ў чатырох раёнах, абслужыла 830 хворых і адпусціла 19.600 працэдур.



Катэджы рабочых Магнітагорскага металургічнага камбіната імені Сталіна ў пасёлку Бярозкі.
Фота В. Некрасава. Фота ТАСС.

ЗІМОВАЯ АЭРАНАВІГАЦЫЯ

МАСКВА. У мінулыя годы ў перыяд зімовай навігацыі палёты рабіліся на машынах, абсталяваных лыжамі. Гэтай зімой усе самалёты стартуюць з Масквы на колах, чым значна павышаецца хуткасць і грузапад'ёмнасць.

На паветранай магістралі Масква—Іркуцк курсіруюць паветраныя экспрэсы «ПС—84» і «ПС — 40». Гэтыя скарасныя машыны, абсталяваныя коламі, паспяхова робяць пасадку на снежных аэрадромах. Снежныя аэрадромы будуць створаны таксама ў розных прамежкавых аэрапартах магістральных паветраных ліній краіны.

ТЭЛЕФОН НА ХАМАР-ДАБАНЕ

Горны хрыбет Хамар-Дабан суровы і недаступны. Да апошняга часу Хамар-Дабанская высокагорная метэастанцыя, размешчаная на вышыні 1.800 метраў над узроўнем возера Байкал, месяцамі была адрэзана ад знешняга свету.

Нядаўна пачата будаўніцтва тэлефоннай лініі Култук—Хамар-Дабан працягам у 25 кілометраў. Ужо пракладзена амаль 18 кілометраў лініі і на працягу 12 кілометраў зроблена падвеска правадоў.

ЦЭМЕНТ З МРАМАРУ

ІРКУЦК. Геолагаразведчая партыя, якая працуе ў гарах каля Байкала, знайшла паблізу станцыі Слюдзянка буйнае месцанараджэнне мрамару, прыгоднага для вытворчасці портланд-цэменту. Запасы гэтага мрамару вылічваюцца ў 150 мільёнаў тон. Зроблены шматлікія лабараторныя аналізы, якія падцвердзілі правільнасць заключэння геолагаў.

КАНСЕРВЫ З СКАТА

ОДЭСА. Работнік украінскай навукова-даследчай станцыі марской рыбнай гаспадаркі і акіянаграфіі Пятроў вывучыў смакавыя якасці мяса, печані і тлушчу ската — рыбы, якая водзіцца ў велізарнай колькасці ў Чорным моры. Яна лічылася няўжытнай. Пятроў згатаваў з мяса і печані ската некалькі ўзораў кансерваў. Мяса аказалася ўжытным. Даследванне тлушчу, атрымоўваемага з печані, паказала, што па ўтрыманню вітаміну А і Б ён значна лепш тлушчаў траскі.

ЗБОР ЧАЙНАГА ЛІСТУ Ў АДЖАРЫІ

БАТУМІ. Аджарыя ў гэтым годзе здала звыш гадавога плана 780 тысяч кілаграмаў высокаякаснага зялёнага чайнага лісту. Зараз на плантацыях у разгары збор лао-ча—грубага ліста, які ідзе на выраб цагельнага чаю. За два тыдні рэспубліка выканала гадавы план на 82 процанты. Паспяхова ідзе перапрацоўка лао-ча.

IX З'ЕЗД КП (б) ЛАТВІІ

З даклада сакратара ЦК КП(б) Латвіі тав. Калнберзіньш

17 чэрвеня 1940 года працоўныя Латвіі звергді буржуазны ўрад і стварылі свой дэмакратычны ўрад. Перад латвійскімі рабочымі, працоўным сялянствам, працоўнай інтэлігенцыяй, а значыць і перад комуністычнай партыяй Латвіі ўстала задача перабудовы краіны на новых, соцыялістычных пачатках. З першых-жа крокаў партыя знайшла падтрымку ў працоўным народзе. Аб гэтым ярка сведчыла перамога блока працоўнага народа на выбарах дэпутатаў у народны сейм 14—15 ліпеня.

— Першым значным мерапрыемствам совецкай улады, — указаў тав. Калнберзіньш, —было пераразмеркаванне зямлі ў вёсцы. Гэта мерапрыемства стварыла трывалую базу для ўзмацнення саюза рабочых і сялян.

— Другім важнейшым крокам совецкай улады, — сказаў тав. Калнберзіньш, — з'явілася нацыяналізацыя банкаў, транспарта і буйных прамысловых прадпрыемстваў. Перад намі адказнейшая задача — ужо ў бліжэйшыя годы ператварыць нашу эканамічна адсталую аграрную краіну ў высокаразвітую прамысловую рэспубліку.

Гэтым кіруемся мы пры складанні народнагаспадарчага плана 1941 года, першага плана соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай рэспубліцы.

Трэцім важнейшым крокам совецкай улады была нацыяналізацыя буйных гандлёвых прадпрыемстваў, пашырэнне і ўзмацненне гандлёвых, дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў у рэспубліцы, ужо займаючых больш паловы ўсяго гандлёвага абароту.

Чацвертым важнейшым мерапрыемствам совецкай улады з'явілася нацыяналізацыя буйных дамоў, пасля якой Наркамату комунальнай гаспадаркі было падпарадкавана 16 тысяч дамоў з 7 мільёнамі квадратных метраў жыллёвай плошчы.

Вялікая ўвага ў справаздачным дакладзе ўдзелена пытанням партыйнага будаўніцтва.

Становішча партыі пасля легалізацыі, гаворыць дакладчык, было даволі незайздросным. У нас не было нават учоту членаў партыі. Цяпер у асноўным наша партыйная арганізацыя прыведзена ў парадак. У сувязі з выдачай партыйных дакументаў выканана адно з галоўнейшых і адказнейшых заданняў — улічаны члены і кандыдаты партыі.

Рэарганізавана структура партыйнай арганізацыі, расстаўлены кадры, укамплектаваны штаты. Арганізавана партыйная школа пры ЦК, адкрыт Дом партактыва, пры якім ёсць бібліятэка, чытальня, лекцыйны зал. Многія члены і кандыдаты нашай партыі абучаюцца ў гуртках гісторыі партыі і бягучай палітыкі. Надзённейшыя пытанні партыйнай работы былі абмеркаваны на толькі што праведзеных павятовых і гарадскіх справаздачна-выбарчых сходах і канферэнцыях, на якіх былі выбраны гарадскія і павятовыя камітэты партыі.

Вялікую падтрымку ў рабоце аказалі і аказваюць профсаюзы і комсамол. Комсамол прымае актыўны ўдзел ва ўсіх кампаніях. Вялікай заслугай профсаюзаў з'яўляецца арганізацыя стаханаўскага руху і соцыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах Латвіі, разгарнуўшыхся ў сувязі з святкаваннем гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР. Аднак дакладчык адзначыў і рад сур'ёзных недахопаў у рабоце комсамола і профсаюзаў.

Затым тав. Калнберзіньш перайшоў к падрабязнаму разбору і крытыцы асноўных недахопаў у партыйнай рабоце. Да іх адносяцца яшчэ недастаткова аператыўнае кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі, бясплаанавасць у рабоце і адсутнасць кантролю за выкананнем сваіх рашэнняў, недачоты ў рабоце па ідэйнаму ўзбраенню членаў партыі, а таксама нізкі ўзровень партыйнага друку.

Неабходна, указаў далей дакладчык, паўсядзённа ўзмацняць партыйны апарат, здольны аператыўна кіраваць усёй партыйнай работай. Трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на выхаванне, падбор і вывучэнне кадраў, а таксама на павышэнне ідэйнага ўзроўню кожнага члена і кандыдата партыі, праяўляць пільнасць ва ўсёй нашай рабоце.

Усё зробленае ў галіне будаўніцтва соцыялістычнай Латвіі, заключыў тав. Калнберзіньш, дасягнута ў вострай класавай барацьбе. Наша партыя прыйшла да свайго першага з'езда ў новых, легальных умовах адзінай і згуртаванай вакол ленінска-сталінскага ЦК ВКП(б), вакол таварыша Сталіна.—

Няхай жыве партыя Леніна — Сталіна!

Няхай жыве правадыр прыгнечаных народаў і працоўных усяго свету таварыш Сталін!

На ранішнім пасяджэнні з'езда 18 снежня працягваліся спрэчкі па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта.

З'езд вітала дэлегацыя рабочай гвардыі. Пад гром апладысментаў у зал увайшлі юнакі, дзяўчаты і пажылыя людзі, апранутыя ў сінія форменыя гімнасцёркі, перапаясаныя рамнём. Гэта рабочыя, якія з першых дзён совецкай улады ўзялі на сябе справу аховы фабрык і заводаў.

На трыбуну падымаецца кіраўнік дэлегацыі шофер тав. Мацун. Ён запэўніў дэлегатаў з'езда, што рабочая гвардыя і надалей будзе пільна ахоўваць соцыялістычную ўласнасць Латвійскай рэспублікі.

З словамі гарачага прывітання і сардэчнай удзячнасці дэлегаты з'езда звярнуліся да Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. І. Калініна і народнага камісара абароны тав. Тімашэнка.

З'ездам атрымана прывітальная тэлеграма ад ЦК комуністычнай партыі бальшэвікоў Літвы.

«Праўда».

* * *

РЫГА, 19 снежня. (ТАСС). Сёння на ранішнім пасяджэнні з'езда працягваюцца спрэчкі па справаздачнаму дакладу ЦК КП(б) Латвіі. Пасля выступленняў тт. Дзеравянскага, Ю. Лаціса, Ванага, Пупура, Шыц, прадстаўніка Чырвонай Арміі т. Лауберга і іншых спрэчкі па справаздачнаму дакладу ЦК КП(б) Латвіі спыняюцца.

Заслухаўшы заключнае слова першага сакратара ЦК КП(б) Латвіі тав. Калнберзіньш, з'езд аднагалосна прымае рэзалюцыю, у якой палітычная лінія ЦК КП(б) Латвіі прызнаецца правільнай, практычная работа—здавальняючай.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд прыступіў да разгляду другога пытання парадку дня—выбары ЦК КП(б) Латвіі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ХТО НЕ БЯРЭ КНІГ У БІБЛІЯТЭЦЫ ПАРТКАБІНЕТА

Пры Дамброўскім райкоме партыі ўжо скора год, як працуе партыйны кабінет. Кабінет заваяваў сабе заслужаны аўтарытэт сярод комуністаў і працоўных раёна. Зараз парткабінет мае вялікую колькасць палітычнай і мастацкай літаратуры. Тут можна знайсці неабходныя матэрыялы ў дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б).

Пры парткабінеце створана кансультацыйнае бюро. Члены гэтага бюро аказваюць індывідуальную дапамогу вывучаючым гісторыю бальшэвізма, праводзяць семінары ў пярвічных партыйных арганізацыях.

Рэгулярна пры парткабінеце праводзяцца семінары агітатараў і прапагандыстаў. У парткабінет штодзённа прыходзіць многа комуністаў, комсамольцаў і інтэлігенцыі навесці тую ці іншую даведку, узяць неабходную кнігу.

Парткабінет перш за ўсё наведвае партыйны, совецкі і комсамольскі актыў. Тут часта чытаюцца лекцыі па тэарэтычных пытаннях. Рэгулярна карыстаюцца кнігамі, наглядными дапаможнікамі і другімі матэрыяламі, якія ёсць у парткабінеце, комуністы тт. Шалыгін, Стрыжакоў, Захараў, Мандрык, Ганчароў і іншыя. Літаратура з партыйнага кабінета з'яўляецца для іх вялікім падспор'ем у справе вывучэння тэорыі марксізма-ленінізма.

Але ў раёне ёсць многа комуністаў, якія недастаткова працуюць над павышэннем узроўню сваіх ведаў. Яны слаба вывучаюць гісторыю партыі. Усе гэтыя таварышы з'яўляюцца рэдкімі гасцямі ў партыйным кабінеце. Сюды яны прыходзяць толькі выпадкова. Загадчык парткабінета тав. Варэнінаў назваў рад комуністаў, якія ні разу не бралі кніг з бібліятэкі парткабінета. Сярод іх трэці сакратар райкома партыі тав. Лемеш, старшыня райвыканкома тав. Саракалетаў, загадчык райза тав. Парахонька, загадчык райфінаддзела тав. Белагур, загадчык райана тав. Бабкоў і іншыя. Між тым уласных кніг у гэтых таварышоў вельмі мала.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што партыйная арганізацыя раёна яшчэ недастаткова займаецца пытаннямі вучобы комуністаў, што індывідуальны кантроль за тым, як комуністы працуюць над сабой, адсутнічае. А некаторыя работнікі, прыкрываючыся спасылкамі на перагружанасць, не працуюць над сабой і нават не чытаюць мастацкай і палітычнай літаратуры. Усё гэта, безумоўна, адбіваецца на іх практычнай рабоце.

В. Г.

—о—

Рыхтуюцца да пешага пераходу

Комсамольцы і несаюзная моладзь г. Гродна і раёна рыхтуюцца да пешага пераходу, які адбудзецца 22 снежня. Амаль на ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, школах створаны каманды, якія праводзяць рэгулярныя трэніроўкі ўдзельнікаў пераходу.

У фізкультурным тэхнікуме арганізавана 6 каманд: чатыры мужчынскіх і 2 жаночых. Тут ужо чатыры разы праводзіліся 15-кіламетровыя трэніровачныя маршы. Многа праароблена і ў школах №№ 5, 9, 16, у настаўніцкім інстытуце, педвучылішчы. Усё падрыхтавана, студэнты і вучні гатовы да ваенізіраванага пераходу.

Г. Л.



Першы сакратар Віцебскага сельскага райкома КП(б)Б тав. В. П. Азаркевіч (справа) гутарыць з комуністамі тт. А. С. Іофе, С. А. Саламонік, М. В. Яноўскім, якія самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

Фота І. Лосева. Фотахроніка БЕЛТА.

АБАРОННАЯ РАБОТА СЯРОД КОМСАМОЛЬЦАЎ

У сваім рашэнні ЦК ВЛКСМ патрабаваў ад комсамольскага актыва здаць нормы на значок «ГПА» («Гатоў да працы і абароны») першай ступені (акрамя плавання) да XXIII гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Члены бюро райкома, члены пленума, сакратары комсамольскіх арганізацый і іх намеснікі, старшыя піонерважатыя і члены пастаянных камісій у асноўным правільна зразумелі важнасць рашэння ЦК ВЛКСМ аб «Фізічнай падрыхтоўцы комсамольскага актыва». Яны паказваюць асабісты прыклад у трэніроўцы і паспяховай здачы норм.

Усяго ў раёне трэніруюцца і здаюць нормы «ГПА» 61 чалавек. З іх ужо здалі па адной норме 37 чалавек, па дзве нормы—7 чалавек, па тры—7 чалавек і па 4 і звыш—10 чалавек.

Сакратар комсамольскай арганізацыі райспажыўсаюза горада Граева тав. Ленда здаў усе нормы на значок «ГПА» першай ступені. Тав. Захарчанка—старшыня ваенна-фізкультурнай камісіі здаў 4 нормы, тав. Ржэўскі—намеснік сакратара райкома комсамола здаў 4 нормы. Але ёсць у нас «актывісты», якія многа гавораць аб важнасці гэтай справы, а самі не здалі ні адной нормы.

Былыя сакратары комсамольскіх арганізацый тт. Трубская і Дамрачоў, дакладваючы на бюро райкома комсамола аб рэалізацыі пастановы ЦК ВЛКСМ, паведамілі, што комсамольцы гэтых арганізацый (гумава-цясёмачнай фабрыкі і сувязі) не здалі ні адной нормы на значок «ГПА». Пасля высветлілася, што яны не прымаюць удзел у трэніроўках, а між тым у пратаколах комсамольскіх сходаў многа разоў былі запісаны іх выступленні, дзе заклікалі комсамольцаў палепшыць фізкультурную работу.

Бюро райкома ЛКСМБ вынесла справядлівае рашэнне аб вызваленні іх ад абавязкаў сакратароў комсамольскіх арганізацый.

Можна знайсці яшчэ такіх «актывістаў», як тав. Лук'янава—сакратар комсамольскай арганізацыі Шчучынскай бальніцы, якая таксама многа гаворыць, але нічога не робіць. 5 снежня, у дзень Сталінскай Канстытуцыі, раённы камітэт комсамола арганізаваў пешы пераход на здачу норм «ГПА» па лыжах, у якім прынялі ўдзел 121 чалавек. Не гледзячы на дрэннае надвор'е, комсамольскі актыў выдатна справіўся з ускладзенай на яго задачай. Тт. Лук'янава, Дамрачоў і комсамольцы іх арганізацый у паходзе не ўдзельнічалі. Старшыня райсовета фізкультуры і спорта тав. Баравой не аказаў ніякай дапамогі ў падрыхтоўцы да паходу. Гэтыя комсамольцы забываюць, што яны носяць пачотнае званне ленінска—сталінскага комсамола. А гэта абавязвае нас быць заўсёды гатовымі, каб выканаць свой доўг у абароне совецкай дзяржавы.

Н. Кобзеў,
сакратар Граеўскага райкома ЛКСМБ.

Семінары па асновах марксізма-ленінізма ў педінстытуце

Студэнты Беластоцкага дзяржаўнага педінстытута дзейсна рыхтуюцца да зімовай экзаменацыйнай сесіі. Зараз паспяхова праходзяць семінары. Асаблівая актыўнасць студэнтаў на семінарах па асновах марксізма-ленінізма. Студэнты глыбока вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і творы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Па кожнаму твору яны складаюць канспекты.

Да паслуг студэнтаў пры інстытуце ёсць кабінет гісторыі ВКП(б) і бібліятэка марксісцка-ленінскай літаратуры. У кабінеце штодзённа збіраецца па 30 і больш студэнтаў для самастойнай работы над матэрыяламі.

Днямі ў інстытуце праводзіўся семінар па 3-му раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і твору Леніна «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі». Семінар паспяхова прайшоў у групе «Б» літаратурнага факультэта, які працягваўся 4 гадзіны. Выступалі амаль усе студэнты групы. Тт. Петрыкевіч, Палякова, Крывец, Марушка выступалі па некалькі разоў. Студэнтка тав. Паеўская ў сваім выступленні дала змястоўны адказ на пытанне аб тактыцы бальшэвікоў у буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі. Тав. Мендэльсон яшчэ больш паглыбіла гэта пытанне, супастаўляючы тактычную лінію бальшэвікоў і меншавікоў, паказваючы антырэволюцыйнасць меншавікоў.

В. Юдо.

Абласная санітарна-авіяцыйная хуткая дапамога

За перыяд існавання ў Беластоку абласной санітарна-авіяцыйнай хуткай дапамогі прайшло толькі 7 месяцаў, а праароблена многа: 316 выклікаў, 677 лётных гадзін, 78 кансультацый спецыялістаў, 21 аперацыя ў райбальніцах, 576 амбулаторных прыёмаў, 19 даставак у розныя раёны вобласці кансерваванай крыві для пералівання і сыроваратак. Усё гэта гаворыць аб тым, што санітарная авіяцыя атрымала ў Беластоцкай вобласці вялікі размах.

Няма такога дня, каб па тэлефону 3-01 не было-б выкліку: «Вышліце самалёт з хірургам», «Патрабуецца кансерваваная кроў» і т. д. Пасля некаторых распытаў на аэрадром імчыцца карэта хуткай дапамогі з урачом-спецыялістам. Не праходзіць 10—15 мінут, як машына ў паветры ляціць найкарацейшым шляхам, дзе яе з нецярплівасцю чакаюць, дзе людзі памінутна падымаюць галовы ўгару і прыслухоўваюцца да гудзення матора, а калі прыкмячаюць кропку на небе, якая паступова вырысоўваецца ў сілуэт самалёта, радасцям няма канца.

Перад намі журнал выклікаў за чатыры дні снежня месяца. Тут мы знаходзім такія запісы: «Карыціна, Саколкаўскага раёна, — дастаўлена цяжка хворая сялянка Сенкевіч Альбіна, 48 год, па повадзу тэрміновага хірургічнага ўмяшання».

«Вёска Рудкі, Замбраўскага раёна,—дастаўлен хворы ў раённую бальніцу па повадзу ранення».

«Вёска Мсцібава, Валкавыскага раёна,—дастаўлена калгасніца калгаса «Першае Мая», Спефанчук Вера, 30 год, па повадзу тэрміновай гінекалагічнай аперацыі».

У валкавыскай бальніцы, пасля цяжкай аперацыі, ляжыць бледная, знямоганая жанчына. На выгляд ёй 50-год, а на самай справе—36. Патрэбна кроў, але дзе яе ўзяць? Званок па тэлефону 3-01—і праз гадзіну 20 мінут кроў была дастаўлена лётчыкам Гусевым.

У Навагрудку, Баранавіцкай вобласці, ляжыць цяжка хворы з невысветленым дыягназам. Па ўказанню наркамата аховы здароўя БССР туды дастаўлен кансультант-спецыяліст.

Звоніць сакратар Снядаўскага райкома КП(б)Б тав. Марозаў: «Гіне чалавек, ратуйце, вышліце ўрача». Доктар Крамаш едзе ў Снядава, кансультыруе трох цяжка хворых. Паведамляе райздраў з Кнышына: «Дзіцё задыхаецца. Хутка шліце самалёт». Праз адну гадзіну 20 мінут дзіцё дастаўлена ў беластоцкую бальніцу.

У Аўгустове, Снядаве, Шчучыне трэба тэрмінова зрабіць пераліванне крыві цяжка хворым. Маленькі чамаданчык, напоўнены крывёю, і самалёт дастаўляе ўрача Высоцкага, які робіць аперацыі пералівання крыві, а калі пры праверцы група крыві не падыходзіць, бярэ сваю кроў і пералівае хвораму (Шчучына, Граеўскі раён).

Такія кароткія выпіскі з журнала, такая кароткая характарыстыка вялікай работы маленькага калектыва ўрачоў і лётчыкаў, якія па першаму выкліку, у непагоду, раніцой ці ноччу, у месцах беспасадачных пляцовак ляцяць на сваім самалёце выконваць любое заданне.

Др. Рапапорт,
загадчык абласной санітарна-авіяцыйнай хуткай дапамогі.

СУЭЦКІ КАНАЛ

(Даведка)

Суэцкі канал пачынаецца ля егіпецкага горада Порт-Саіда (усходняя частка Міжземнага мора) і заканчваецца ў г. Суэце, ля ўваходу ў Краснае мора. Даўжыня канала — 162 кіламетры (не лічачы падыходаў). Шырыня — ад 68 да 120 метраў, навігацыйная шырыня — 66 метраў. Найменшая глыбіня — 13 метраў; па ім могуць хадзіць судны з асадкай да 11 метраў, гэта значыць з асадкай лінейных караблёў. Час праходу канала рознымі суднамі хістаецца ад 12 да 15 гадзін.

Канал злучае Міжземнае і Краснае моры. Такім чынам ён звязвае найкарацейшым шляхам Еўропу з Азіяй і ўсходнім узбярэжжам Афрыкі; Міжземнае мора — з Індыйскім і Ціхім акіянамі. Адлегласць ад Марселя (Францыя) да Сайгона (цэнтр Французскага Інда-Кітая) вакол Паўднёвай Афрыкі складае 12 тыс. марскіх міль, а праз Суэцкі канал — толькі 6.500. Ад Марселя да Таматавы (Мадагаскар) — адпаведна 8.500 і 5.000 марскіх міль. Адлегласць ад Генуі (Італія) да цэнтра Італьянскай Эрытрэі — Масауа вакол Паўднёвай Афрыкі—10.500 марскіх міль, праз Суэцкі канал — толькі 3.000 міль, гэта значыць у тры з палавінай раза карацей. Шлях ад Лондана да Бамбея (Індыя) дзякуючы каналу скарачаецца амаль на 5.000 марскіх міль.

Па грузаабароту Суэцкі канал займае першае месца сярод каналаў свету. У 1937 г. праз канал прайшло больш пяці тысяч суднаў з грузам у 36.491 тыс. тон. Для Вялікабрытаніі гэта важнейшы ўчастак у яе камунікацыях, важнейшы транспартны нерв імперыі. Праз Суэцкі канал да апошняга часу ў Англію дастаўлялася 90 проц. усяго імпарта джута і пянькі, 94 проц. каўчука, 90 проц. чая, 62 проц. свінца. Гэтым-жа шляхам Англія атрымлівала нафту з Ірана, бавоўну з Індыі, шэрсць, масла, сыр з Аўстраліі і т. д. Англійскія машыны, метал, тэкстыль і іншыя тавары накіроўваліся ў краіны Індыйскага і Ціхага акіянаў, ва Усходнюю Афрыку таксама праз Суэцкі канал.

Не менш важнае значэнне мае Суэцкі канал і для Італіі. У мірны час звыш 17 проц. усяго італьянскага імпарта праходзіла праз Суэцкі канал. У 1930 годзе на Лонданскую марскую канферэнцыю быў



прадстаўлен афіцыяльны італьянскі мемарандум, у якім было сказана, што «тры чвэрці снабжэння, ад якога залежыць Італія, дастаўляецца да яе праз Суэц, Гібралтар і Дарданелы» і што «адначасовая паралізацыя іх пацягнула-б катастрофу для Італіі».

У 1936 годзе 46 проц. танажа прайшло праз Суэцкі канал пад англійскім флагам, 19 проц. —пад італьянскім. Астатні танаж належаў Германіі, Галандыі, Францыі, Нарвегіі, Грэцыі, Японіі і іншым краінам.

Пабудова Суэцкага канала была пачата ў 1859 годзе і закончана ў 1869 г. У фінансіраванні будаўніцтва ўдзельнічалі ў асноўным французскі і часткова італьянскі капіталы. Тэрыторыя, па якой была пракладзена траса канала, належала (і належыць у сучасны момант) Егіпту. У выніку таго, што егіпецкі ўрад забяспечваў будаўніцтва рабочай сілай, ён атрымаў адну трэць акцый кампаніі Суэцкага канала. У 1875 г. прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дызраэлі, скарыстаўшы цяжкае фінансавае становішча егіпецкага хэдыва, набыў атрыманы Егіптам пакет акцый. У выніку з агульнай колькасці 400.000 акцый, выпушчаных кампаніяй, англійскі ўрад стаў уладальнікам 177.000 акцый.

Суэцкі канал эксплаатуецца Міжнароднай кампаніяй, у састаў якой уваходзяць французы, англічане і галандцы. Згодна статута ў Совеце кампаніі $^{2}/_{3}$ складаюць французы і $^{1}/_{3}$ — англічане. Але колькасць акцый, якімі ўладае Англія, дае ёй магчымасць быць фактычным гаспадаром канала.

З 1882 года ў зоне канала знаходзяцца англійскія ваенныя сілы. На дагавору, заключанаму з Егіптам, Англія мае права ў ваенны час трымаць войскі на ўсёй тэрыторыі Егіпта. Сетка сучасных умацаванняў, стратэгічных чыгунак, пасадачных пляцовак, пабудаваных Англіяй, пакрывае цяпер усю зону Суэцкага канала.

Эканамічнае і стратэгічнае значэнне канала зрабілі яго адным з важнейшых аб'ектаў барацьбы паміж Англіяй і Італіяй.

Італьянскае наступленне на Егіпет, абвастрэнне становішча ва ўсходняй частцы Міжземнага мора (Італа-грэчаская вайна) звязаны, відаць, з пэўнымі планамі ў адносінах гэтага буйнейшага транспартнага вузла. У барацьбе за Егіпет, за пананаванне над Суэцкім каналам галоўнымі дзеючымі сіламі выступаюць сухаземныя арміі, ваенна-марскі і паветраны флоты Італіі і Англіі.

Н. А.

У ДОМІКУ НІКАЛАЯ ОСТРОЎСКАГА

Сочы. Тут самы ціхі куток. Стройныя кіпарысы абступілі белы домік і замёрлі быццам вартавыя. У гэтым доміку, пабудаваным урадам Украіны, правёў свае апошнія годы выдатны чалавек нашай эпохі, пісьменнік-баец Нікалай Астроўскі.

22 снежня 1936 года неўмалімая смерць спыніла гарачае сэрца аддадага сына нашай радзімы. Прайшло чатыры годы, а тут усё засталося па-ранейшаму, і здаецца, што жыхар гэтага доміка толькі-што яго пакінуў.

Сярод прасторнага пакоя стаіць шырокі ложак з адной спінкай, пакрыты шарсцяной коўдрай з вытканымі на яе краі кветкамі. Побач з ложкам стаіць столік. На ім пішучая машынка з апошнім лістом работы Нікалая Астроўскага. Некалькі радыёпрыёмнікаў, кніжны шкаф, поўны кніг.

Арганізм Нікалая Астроўскага быў разбуран страшнай хваробай: параліч усяго цела, вечная слепата. Усё гэта было вынікам цяжкага ранення на фронце грамадзянскай вайны. Аднак ён ні на мінуту не выходзіў з радоў будаўнікоў соцыялізма. Нікалай Астроўскі, прыкаваны хваробай, узяўся за пяро і стварыў выдатныя творы: раман «Як гартавалася сталь» і аповесць «Народжаныя бурай».

Апошнія старонкі аповесці «Народжаныя бурай» памечаны — 11 снежня 1936 года. Сваё абяцанне ЦК ВЛКСМ — здаць у набор апошні ліст рукапісу гэтай аповесці да 15 снежня,—ён выканаў раней тэрміну на чатыры дні.

Аб тым, што жыхар гэтага доміка больш сюды не вернецца, напамінае толькі тое, што на высокай падстаўцы, пад шклом, пакоіцца ордэн Леніна, якім быў узнагароджан Нікалай Астроўскі. У адным з пакояў размешчаны матэрыялы аб дзіцячых і юнацкіх гадах Нікалая Астроўскага. На адной з карцін—5-гадовы Коля ізабражон седзячым на парозе школьнага класа і ўважліва слухаючым урок (настаўніца дазваляла яму сядзець на парозе з умовай сядзець ціха).

Коля навучыўся чытаць з чатырох год. У дзіцячыя і юнацкія годы ён чытаў многа, і ў вітрынах выстаўлены любімыя яго кнігі: «Спартак», «Авадзень» і інш.

Пераходзячы ад аднаго да другога дакумента, экспаната, карціны, пісьма, рукапісу, бачыш, як фарміраваўся будучы пісьменнік. Настача пагнала маленькага Колю на заработкі спачатку кубоўшчыкам у буфет на ст. Шэпетоўка; потым ён стаў качагарам на электрастанцыі, у годы рэволюцыі паступае рассыльным у рэўком. У адной з аўтабіяграфій Нікалай Астроўскі так апісвае паступленне ў комсамол: «Разам з комсамольскім білетам мы атрымалі ружжо і 200 патронаў».

Незгасаючай славай пакрылі сябе комсамольцы — удзельнікі грамадзянскай вайны. Сярод іх быў і Нікалай Астроўскі—баец 1-й Коннай Арміі. У адным з шкафаў вісіць шлем і гімнасцёрка—падарунак пагранічнікаў. Памёр Нікалай Астроўскі з прысвоеным яму званнем брыгаднага камісара.

Нікалай Астроўскі, адстойваючы вернасць карчагінскага шляху, сам да апошняй мінуты быў стойкім большэвіком, ненавідзячым эгістаў і трусаў, панічна хаваючыхся ад малейшай цяжкасці. Над увахадам у яго пакой на чырвоным палатне напісаны яго яркія словы—«Хто не гарыць, той кадціць». І гэты «закон» Нікалай Астроўскі пранёс праз усё жыццё і праз свае творы «Як гартавалася сталь» і «Народжаныя бурай». На гэтых героічных кнігах вучацца і выхоўваюцца мільёны моладзі нашай краіны, у іх чэрпаюць сілу волі к далейшай барацьбе рэволюцыянеры ў засценках капіталістычных турмаў.

У музеі захоўваецца арыгінал пісьма рыжскіх палітзняволеных, якія пісалі Нікалаю Астроўскаму: «...Паўка стаў нам сваім, блізкім, на каторага мы ўсе хочам раўняцца». Зараз адпускаючы аўтары гэтага пісьма, стаўшыя свабоднымі з устанаўленнем совецкай улады ў Латвіі.

Нікалай Астроўскі ў кругу сваіх сяброў часта гаварыў аб прыгнечаных польскімі панамі беларускім і ўкраінскім народах. Ён сцвярджаў, што «польская дзяржава на сваіх гліняных нагах доўга не пратрымаецца». Ён марыў аб вызваленні гэтых народаў.

Гэта здзяйсняючая прадбачанасць апраўдалася ў верасьнёўскія дні 1939 года, калі народы заходніх абласцей Беларусі і Украіны набылі свабоду і шчаслівае жыццё.

З прыходам Чырвонай Арміі навечна канула ў мінулае праклятае панаванне польскіх паноў. Народы Совецкага Саюза ніколі не забудуць свайго баявога сына, палкага большэвіка, пісьменніка-байца Нікалая Астроўскага.

Музей у Сочы значна пашыран. З усіх канцоў неабсяжнай нашай радзімы прыходзяць сюды, каб яшчэ глыбей вывучыць выдатнае, поўнае гераізма жыццё Нікалая Астроўскага.

А. Астаф'еў.

Сочы—Беласток, 10-XII-1940 г.

Справы і людзі Граеўскай МТС

На загоне стаяў трактар. Яго вадзіцель Станіслаў Цэпко вазіўся ля машыны. Многае яму яшчэ было невядома. Ён яшчэ не паспеў вывучыць асобныя капрызы сваёй машыны. Станіслаў Цэпко нервуецца і ніяк не можа разгадаць сакрэты астаноўкі машыны. Матор па-ранейшаму заглушаўся. У гэты час да машыны падышоў старшы механік машынна-трактарнай станцыі тав. Сяргееў. Завёўшы яшчэ раз матор, механік уважліва прыслухаўся да яго работы. Яшчэ мінута — і Сяргееў, звяртаючыся да трактарыста, сказаў: «Глушы матор! У запальванні ў цябе нядобра. Зараз пагляздзім свечы і магнето. Бачыш, што бывае. Гэта не тое, што на курсах».

Так пачаў сваю работу на трактары Станіслаў Цэпко, селянін-бядняк вёскі Пьяходы.

Адначасова з Станіславам пачала работу трактарыстка Марыя Мазуль. Калі яна выязджала на курсы, у вёсцы Раджэва многія гаварвалі: «Нічога не выйдзе з яе. Гэта не бабская справа. Сядзела-б дома, да жаніхоў чакала». Але Марыя цвёрда рашыла сесці за руль трактара, стаць перадавой трактарысткай.

Разам з сваім аднавяскоўцам Садоўскім Марыя пачала свой першы загон. З вёскі на поле прыходзілі хлопцы і дзяўчаты. Яны падоўгу хадзілі за машынай, на астаноўках распытвалі трактарыстку, цікавіліся вучобай на курсах.

З першых дзён арганізацыі машынна-трактарнай станцыі да дырэктара штодзённа прыходзілі хлопцы, дзяўчаты з просьбай накіраваць іх на курсы механізатараў. Адны хацелі атрымаць кваліфікацыю камбайнераў, другія—трактарыстаў, механікаў. Не было магчымасці ўсіх паслаць на курсы. І тады многія прасілі прыняць іх прычэпшчыкамі. З імі была арганізавана вучоба без адрыву ад вытворчасці. Па вечарах збіраліся прычэпшчыкі і аваладвалі складаным майстэрствам кіравання трактарам. За мінулы год па Граеўскай МТС падрыхтавана 26 чалавек трактарыстаў, машыністаў, механікаў і памочнікаў трактарыстаў.

... Заканчваліся палявыя работы. Даворваліся апошнія гектары зябліва. Але ўпераздзе яшчэ многа работы. Машынны парк неабходна адрамантаваць і прывесці ў поўны парадак, каб у баявой гатоўнасці сустрэць другую большэвіцкую вясну.

На сядзібу МТС адна за другой сталі прыходзіць машыны. Павінен быў пачацца асенне-зімовы рамонт трактараў. Але будаўніцтва машынна-трактарнай майстэрні яшчэ далёка не закончана. У такой майстэрні нельга пачынаць разборку машын.

У кабінеце дырэктара МТС сабраліся ўсе рабочыя і служачыя. Да позняй ночы абмяркоўваліся пытанні рамонту. Нарада прыняла рашэнне: «Заўтра-ж усім трактарыстам, прычэпшчыкам і механікам узяцца за заканчэнне будаўніцтва майстэрні».

Раніцой на наступны дзень у майстэрні закіпела работа. На дапамогу будаўнічай брыгадзе выйшлі ўсе рабочыя МТС. Праходзіць некалькі дзён—у майстэрню былі завезены першыя трактары. Укамплектавалі рамонтныя брыгады, склалі і абмеркавалі графік рамонту. Калектыў узяў абавязацельства своечасова адрамантаваць трактары і сельскагаспадарчыя машыны. Гэта абавязацельства падмацоўваецца практычнымі справамі. Амаль усе працуючыя на рамонце перавыконваюць нормы выпрацоўкі.

...У кабінеце намесніка дырэктара па палітчасці тав. Крапчацова вісіць вялікая дыяграма. Яна паказвае рэзультаты першага года работы. Побач вісіць дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва з калектывам гродненскай машынна-трактарнай станцыі. На асобным лісце паперы паказана выпрацоўка кожнай брыгады, кожнага трактарыста.

Калектыў Граеўскай МТС упорна змагаўся за першынства з гродненцамі. Гэта першынства заваявана. МТС выканала гадавы план трактарных работ на 108 працэнтаў. У асобнай дыяграме паказана выпрацоўка трактарнай брыгады тав. Лушнікава. Гэта брыгада ўзарала 1.200 гектараў пры плане 900.

Надзвычайных вынікаў дабіўся і малады трактарыст Станіслаў Цэпко. На сваім трактары ён узараў 178 гектараў замест плана 150. Сярод машыністаў першым ідзе тав. Салкоўскі. Норма на яго малатарню ў дзень была ўстаноўлена 10 тон зярна. Ён намалочваў у суткі да 20 тон.

З такімі рэзультатамі сустракае новы год калектыў Граеўскай машынна-трактарнай станцыі.

В. Гарбанёў.



Трактарысты—стаханаўцы Віцебскай МТС С. Т. Янчэнко (злева) Е. І. Голубеў, выконваючые нормы на 120—130% за зборкай адрамантаванага трактара ХТЗ. (Фотохроніка БЕЛТА).

Праверыць на ўсхожасць усё насенне

Кантрольна-насенныя лабараторыі адыгрываюць вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі высокаякаснага насення да пасеву. У нашай вобласці створана 8 міжраённых і 1 абласная кантрольна-насенная лабараторыя. Калгасы на практыцы ўпэўніліся, якое мае значэнне кантрольна-насенная лабараторыя. Вясной і ўвосень яны правяралі сваё насенне на ўсхожасць і чыстату.

Раней працоўнае сялянства аб гэтых агратэхнічных мерапрыемствах не мела ніякага прадстаўлення. На сходзе ў калгасе імені Молатава, Заблудаўскага раёна, раённы агроном аб'ясняў калгаснікам значэнне праверкі насення ў кантрольна-насенных лабараторыях. На сходзе выступіў калгаснік Іван Астравецкі, які расказаў, як у 1937 годзе ён і яго сусед Канстанцін Новік купілі на базары па 150 кілаграмаў лубіну. «Здаецца, — гаварыў Іван Астравецкі, — зярно было добрае, — але не ўзышло. Прапалі грошы, прапала зярно. Цяпер, калі лабараторыя правярае насенне, такіх выпадкаў быць не можа.

А раней ніхто з нас ніякіх лабараторый не ведаў. Засявалі і не ведалі, узыйдзе насенне ці не».

Раённыя зямельныя аддзелы павінны арганізаваць работу так, каб кожны калгас праверыў сваё насенне на ўсхожасць і чыстату. Аднак да гэтага часу яшчэ не ўсюды паср'ёзнаму адносяцца да падрыхтоўкі высокаякаснага насення. Зараз у калгасах праводзіцца засыпка і ачыстка насенных фондаў яравых культур. Разам з гэтым неабходна арганізаваць праверку пасеўнага матэрыялу ў кантрольна-насенных лабараторыях. Да веснавой сяўбы трэба падрыхтаваць высокаякаснае насенне.

Да 1-га студзеня павінна быць закончана першая праверка насенных фондаў яравых культур у падсобных гаспадарках прадпрыемстваў. Аднак яшчэ ні адна падсобная гаспадарка не прадаставіла насення для праверкі.

Работнікі зямельных органаў павінны памятаць, што адным з важнейшых мерапрыемстваў у барацьбе за высокі ўраджай з'яўляецца высокаякаснае насенне. Таму неабходна неадкладна прыняць меры, каб усё насенне да веснавой сяўбы было праверана ў кантрольна-насенных лабараторыях.

Агроном С. Саліт.

Клапатлівыя адносіны да хворых
(Пісьмо ў рэдакцыю)

Маё трохмесячнае дзіцё яшчэ летам захварэла дзэнтэрыяй. Хвароба прагрэсавала каля 4-х месяцаў, прычым дзіцё да такой ступені пахудзела і страціла ў вазе, што не было ўжо надзеі на яго выздараўленне. Я звярнулася за дапамогай да доктара Д. Кагана — урача першай дзіцячай паліклінікі горада Беластока. Дзякуючы яго выключна чулым адносінам, дзіцё папраўлялася. Доктар Каган не лічыўся з позднім часам, цемрай, дажджом і без выкліку пастаянна наведваў хворае дзіцё.

А. Шпагіна.

У Беластоцкіх мастакоў

У будучым годзе да ленінскіх дзён у Маскве адкрыецца выстаўка рысункаў, ілюстрацый к «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)».

Беластоцкія графікі тт. Краеўскі, Малярэвіч, Ляндау і Кшэчаноўскі рыхтуюць да гэтай выстаўкі рад рысункаў пра новую совецкую рэчаіснасць у заходніх абласцях Беларусі.

Пісьменнік-баец

На маленькім, прысунутым к пасцелі рабочым стале — рукапіс. Лісты, сэрчаныя чырвонымі алоўкам, захоўваюць сляды вялікай, крапатлівай работы пісьменніка.

Раскрыта апошняя старонка:

— Гэй, там, у доме, здаецеся?

— Пайшоў к чорту, гад! Будзем біцца да апошняга.

— Няхай жыве комуна! — крыкнуў Андрый.

Гэта — заключныя словы рамана, апошнія напісаныя аўтарам словы. «Няхай жыве комуна!» — дэвіз усяго жыцця пісьменніка, змагара-большэвіка Нікалая Астроўскага.

... Прадаўгаваты пакой напоўнен змрочным ружовым святлом. Позна вечарам, калі канчаўся 12—14-гадзінны дзень пісьменніка і прыпынялася ціхае шуршанне алоўка, — Астроўскі прасіў выключыць яркае, раздражаўшае ўспаленыя нябачачы вочы святло, і запаліць насценную лямпу. Ружовае кавалак чырвонага шоўку, накінутага паверх абажура, і ад таго абрысы пакою мякчэй, рэльефней. Зашкліненая кніжная шафа з творамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Дыван, пісьменны стол, на ім кнігі «Як гартавалася сталь» і «Народжаныя бурай», рабочыя папкі, пісьмы, чытачоў, прышоўшыя з-за рубяжа, з усіх канцоў Совецкага Саюза — з Уладзівастока, Тбілісі, Ташкента, Улан-Удэ, Ленінграда...

Сюды ў Маскву, у гэту кватэру, у пачатку зімы 1936 года прыехаў Нікалай Астроўскі з сонечнага прыморскага Сочы. Ён прыехаў з сабой асобную главу свайго новага і апошняга рамана «Народжаныя бурай».

У гэтым доме на вуліцы Горкага праходзілі апошнія месяцы напружанага творчага жыцця пісьменніка.

15 лістапада 1936 года тут сабраўся прэзідыум Саюза совецкіх пісьменнікаў, прысвечаны абмеркаванню рамана «Народжаныя бурай». Нікалай Астроўскі даў слова закончыць работу над першай часткай рамана на працягу месяца. І, не гледзячы на хваробу, мучыўшую яго ў гэты час асабліва жорстка, ён стрымаў сваё слова.



«Я павінен жыць, каб напісаць кнігу, якая запаліла-б сэрцы моладзі», — гаварыў ён. За 10 дзён да смерці кніга была ім закончана. Сярод экспанатаў музея —першае выданне рамана «Народжаныя бурай».

... Мара пісьменніка ажыццявілася. Кнігі яго запальваюць сэрцы мільёнаў; на дубцы года пісьменнік Астроўскі астаўся рэальным удзельнікам вялікай жыцця, натхняючы людзей на працу, на барацьбу.

У вітрынах — кнігі на рускай, казахскай, малдаўскай, чувашскай, грузінскай—па сарака мовах народаў СССР і на 14-і заходне-еўрапейскіх мовах. Раман «Як гартавалася сталь» перакладзен на мовы і тых народнасцей, якія атрымалі пісьменнасць толькі ў пядыі час, пры совецкай уладзе.

Рад карцін і ілюстрацый, выстаўленых у музеі, малюе змест твораў пісьменніка.

Задорлівы сінявокі хлапчук —качагар з цукровага завода — Андрый Птаха. Гэты юнак-хлопчык робіць смелыя, сапраўды гераічныя справы. Незабываемая сцэна ў кацельнай, адважная смеласць Андрыя, трывожны, клікаючы на бой гудок, смяценне, сумятня ў стане ворага.

Хто не пазнае ў ліхім байцукоміку на шэрым з адсечаным вухам калі — любімага героя і друга ўсёй совецкай моладзі—Паўла Карчагіна?

Яснасць мэты, настойлівасць у дасягненні мэты, цвёрдасць характару, ламаючая ўсе і ўсякія перашкоды,—такія характэрныя рысы новага совецкага чалавека, рысы героя нашага часу. Такі Павел Карчагін.

«Што рабіць?»—пытаў сваім раманам вялікі рускі асветнік Чарнышэўскі, і кожны яго радок быў пранікнут страснай верай у лепшае будучае, марай аб новым чалавеку. На кнізе Чарнышэўскага выхоўваліся пакаленні, але гэтая кніга не магла ўказаць рэальных шляхоў вызвалення, не давала канкрэтнай праграмы барацьбы і дзеяння.

Совецкі пісьменнік Нікалай Астроўскі, прадаўжаючы слаўныя традыцыі рускай літаратуры, дае ў сваёй кнізе вобраз маладога чалавека новай комуністычнай маралі, чалавека, прайшоўшага скрозь годы грамадзянскай вайны, соцыялістычнага будаўніцтва і ўзнятага на камандныя вышыні жыцця, аўладаўшага навукай і культурай. Гэтым вобразам пісьменнік раскрыў ленінска-сталінскую праўду жыцця, аказаў на пытанне—як жыць, што рабіць?

«Самае дарагое ў чалавека—гэта жыццё...—гаворыць герой рамана «Як гартавалася сталь» Павел Карчагін.—І пражыць яго трэба так, каб не было мучыцельна балюча за бязмэтна пражытыя годы, каб не паліла ганьба за подленькае і дробязнае мінулае і каб, паміраючы, змог сказаць: усё жыццё і ўсе сілы былі аддадзены самаму прыгожаму ў свеце — барацьбе за вызваленне чалавецтва».

Нікалай Астроўскі—пісьменнік новага пакалення людзей соцыялізма. Яго творчасць і жыццё знаходзяцца ў цэласным, неразрыўным адзінстве, жыццё яго было такое-ж мужнае і гераічнае, як і жыццё герояў яго кніг.

Астроўскі, прышоўшы ў літаратуру, запечатлеў у сваіх творах і ўласнае жыццё, рамантыку мінулых гадоў, героіку творчых совецкіх будняў.

У залах музея крок за крокам раскрыта суровая і прыгожая аповесць аб жыцці пісьменніка-большэвіка.

...Вузкая прасёлачная дарога ў рытвінах і выбаінах, аблупленыя, пашарэўшыя ад пылу мазанкі, падслепаватыя маленькія ваконцы,—такой была Вілія, радзіма Астроўскага, у 1904 годзе. Мастак Махоцін пісаў гэту карціну па ўспамінах сястры і мацеры пісьменніка, бо ўсяго толькі год назад сяло Вілія стала совецкім. Расказваюць: «Калі перадавыя часці Чырвонай Арміі перайшлі граніцу, каб вызваліць брацкія народы ад панскага га, у адной з бядняцкіх хат знайшлі хворага юнака, якога жандары збілі да паўсмерці за тое, што знайшлі ў яго кнігу Астроўскага «Як гартавалася сталь».

Астроўскі жыў у вялікай нястачы, і для таго, каб пракарміць сям'ю, мацеры пяродка прыходзілася купляць у жабракоў сабраныя імі кускі. Нельга глядзець без пачуцця глыбокай горачы на фатаграфію, ізабражаючую сыры і цёмны падвал—кухню шэпетоўскага рэстарана, дзе Астроўскі працаваў «кухонным хлопчыкам».

Музей захоўвае комсамольскі білет Нікалая Астроўскага—№ 8144911. Год уступлення ў комсамол—1919. Гэта быў год, калі ўся краіна ператварылася ў гіганцкі ўсячаўвёрстны фронт, калі капіталізм вёў шалёнае наступленне на першую ў свеце краіну Советаў, імкнучыся задушыць яе рукой інтэрвентаў і белагвардзейцаў.

Партыя Леніна—Сталіна паднімае ўвесь народ на грамадзянскую вайну. Як і ўсе лепшыя людзі сваёй радзімы Нікалай Астроўскі ідзе на фронт. Разам з комсамольскім білетам атрымлівае ён вінтоўку, 200 патронаў і наказ перамагчы ворага. Скульптура ізабражае Астроўскага байцом праслаўленай дывізіі Катоўскага. Шабля абнажона, імклівы імчыцца баец Астроўскі на варожыя рады.

Камандзір часці, байцом якой быў Астроўскі, успамінае: «Ён трапіў на ўчастак, які ў той перыяд пяцітысячных баёў з азвярэлым ворагам патрабаваў асобай цямкасці, адвагі і адданасці справе пралетарыята, справе Леніна—Сталіна. На лёс мададога Астроўскага выпала найцяжэйшая работа сувязнога, кавалерыста-разведчыка, якую ён з велізарнейшым энтузіязмам і няставай адвагай выконваў у складанейшай абстаноўцы грамадзянскай вайны, дапамагаючы Чырвонай Арміі перамагаць ворагаў народа».

Рад карцін, фатаграфій і дакументаў паказвае Астроўскага на ўдарнай будоўлі ў Баярцы, пад Кіевам, на кіруючай комсамольскай рабоце ў складаных умовах пагранічнай паласы.

Астроўскі жыў адным жыццём з усёй краінай, адным лёсам з лепшымі яе людзьмі. У 1924 годзе ён уступае ў партыю Леніна— Сталіна.

Рэволюцыя нараджае герояў у самых разнастайных галінах нашага жыцця. Астроўскі належыць да гэтага пакалення герояў. І іменна таму ён знайшоў у сабе сілы перамагчы новага і страшнага ворага — невылечную фізічную недуг, пасціўшую яго ў рэзультаце старога баявога ранення.

«Фізічна згубіў амаль усё, засталася толькі незгасаючая энергія маладосці і страснае жаданне быць чым-небудзь карысным сваёй партыі, свайму класу».

Большэвік можа працаваць, пакуль у яго грудзях стучыць сэрца. «Няхай жыве праца і барацьба»,—гаворыць Астроўскі, і скаваны хваробай, сляпы, ён упорна прадаўжае сваю літаратурную работу.

Але як пісаць? Радкі набягаюць адзін на другі, літары зліваюцца. Тады ўзнікае мысль аб транспаранце. У музеі ёсць гэты транспарант, вынайдзены самім пісьменнікам: звычайная картонная папка з прадольнымі выразамі на адным баку. У яе закладваліся лісты паперы, і Астроўскі пісаў, намацваючы пальцамі выразы-радкі. Калі былі свабодны жонка ці сястра, пад дыктоўку пісалі яны. Пісалі пад дыктоўку сябры, чытачы.

І вось у 1934 годзе з друку выходзіць абедзве часткі рамана «Як гартавалася сталь». У лістападзе 1936 года закончана першая частка «Народжаных бурай». «Я хачу, — гаварыў Астроўскі, каб у часе чытання маёй кнігі чытачом авалодала выдатнейшае з пачуццяў—пачуццё адданасці нашай вялікай партыі».

Голас пісьменніка-большэвіка быў пачут не толькі мільёнамі совецкіх грамадзян, для якіх Павел Карчагін стаў узвышаючым прыкладам, — ён пранёсся і за рубяж як заклік да свабоднага жыцця і перамогі.

Барацьбіты за вызваленне працоўных Латвіі, заключоныя ў рыжскай турме пры панаванні буржуазіі, пісалі Астроўскаму:

«Многія з нас, падобна Паўлу Карчагіну, не раз у мінуту роспачы гаварылі сабе: «На што ты будзеш здатны пасля турмы? І ці варта жыць такому калеку, руіне»... І Павел сказаў нам: «Варта!».

Мэта жыцця Астроўскага дасягнута. Сваімі кнігамі ён назаўсёды застаецца ў радах будаўнікоў соцыялізма.

Так усім сваім жыццём, сваёй творчасцю мужны баец-большэвік сцвярджае вялікае шчасце барацьбы і радасць творчай натхнёнай працы.

І. Румер.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

«ДЭЙЛІ МЕЙЛ» АБ ПРАДСТАЯЧЫМ КОНТРНАСТУПЛЕННІ ІТАЛЬЯНСКІХ ВОЙСК

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Дэйлі мейл» перадае з Корчы, што, як чакае грэчаскае ваеннае камандаванне, італьянскія войскі пяройдуць у контрнаступленне на працягу бліжэйшых 4—5 дзён. У цяперашні час італьянцы сканцэнтрыравалі вялікую колькасць сіл для наступлення на Паградзец.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ У АЛБАНІІ

НЬЮ-ЙОРК, 20 снежня. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс, італьянцы эвакуіраваліся з Тэпелене, знішчыўшы ўсё снаражэнне, якое там мелася. Па маючыхся звестках, італьянцы панеслі вялікія страты. У прыбярэжным сектары паміж Палермо і Хімара грэкі акружылі буйныя сілы італьянцаў, якія прабуюць праврвацца праз акружэнне.

Як перадае агенцтва, яшчэ ў мінулым тыдні грэкі занялі частку Палермо, аднак італьянцы прадпрынялі контратаку і выбілі грэкаў з горада. На паўночным фронце моцны снегапад перашкаджае развіццю буйных аперацый Разведвацельны атрад грэкаў захапіў тут у палон аднаго італьянскага афіцэра і 150 салдат, якія сур'ёзна пацярпелі ад холада і не маглі аказаць супраціўлення.

КАМЮНІКЕ АНГЛІЙСКАГА АДМІРАЛТЭЙСТВА

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае камюніке англійскага адміралтэйства, у якім гаворыцца, што цяжкія і лёгкія ваенна-марскія сілы англійскага міжземнаморскага флота падверглі раён Бардзіі бамбардыроўцы, працягваўшайся з перапынкамі з вечара 13 снежня да поўдня 18 снежня.

Пасля поўдня 16 снежня адно з злучэнняў англійскіх цяжкіх караблёў падверглася беспаспяховай атацы самалётаў-тарпеданосцаў праціўніка. Аднак ні адзін карабль не быў пашкоджан. У выніку абстрэла з мора пасля поўдня 15 снежня ў Бардзіі пачаўся моцны пажар, які не спыняўся да 17 снежня. У той-жа дзень раніцой адно з злучэнняў лёгкіх караблёў атакавала порт Бардзіі з вельмі кароткай дыстанцыі. Не гледзячы на моцны кулямётны агонь, англійскія караблі праніклі ў гавань і патапілі тры дапаможных судны праціўніка.

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што, згодна камюніке міністэрства авіяцыі, самалёты англійскай берагавой абароны прадпрынялі ўчора ўдзень паспяховыя налёты на аэрадром Ле Тукэ (паблізу Парыжа), а таксама на Маперцюі (Францыя).

Як указваецца ў камюніке, англійскія ваенна-паветраныя сілы бамбардыравалі ў ноч на 20 снежня ваенныя аб'екты ў Заходняй Германіі, у тым ліку прадпрыемствы па вытворчасці сінтэтычнай нафты, электрастанцыі і адзін з чыгуначных вузлоў.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 20 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: Адна германская падводная лодка патапіла саракавое па счоту гандлёвае судна праціўніка. Агульнае вадазмяшчэнне патопленых гэтай лодкай караблёў складае 208.975 рэгістравых брута-тон.

Учора германская авіяцыя правадзіла разведвацельныя палёты над тэрыторыяй Англіі. У праліве св. Георга на поўдзень ад мыса Карнсор удалося патапіць гандлёвае судна танажам у 1.200 рэгістравых брута-тон. У ноч на 20 снежня германскія бамбардыроўшчыкі зрабілі паспяховыя налёты на важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў цэнтры Лондана. Бомбы, скінутыя ў гэту ноч англійскімі самалётамі над Заходняй Германіяй, прычынілі толькі нязначныя пашкоджанні.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора ўдзень над тэрыторыяй Англіі быў знішчан адзін германскі бамбардыроўшчык. Ні адзін з раёнаў не даў паведамленняў аб бамбардыроўцы. Увечары ўпершыню за апошнія 2 дні ў Лондане была аб'яўлена непрацяглая паветраная трывога. Аднак над горадам германскія самалёты не паяўляліся.

У ноч на 20 снежня германская авіяцыя зрабіла ўпершыню за апошнія 4 дні налёт на Англію, у час якога была скінута невялікая колькасць бомб у Паўночнай і Паўночна-Усходняй Англіі. Урон нязначны. Колькасць афяр невялікая.

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Газета «Дэйлі тэлеграф энд морнінг пост» піша, што за апошні час аперацыі германскай авіяцыі характэрызуюцца толькі разведвацельнымі палётамі асобных самалётаў. Гэта дае аснову меркаваць, што немцы, магчыма, заняты зараз рыхтаваннямі да ўтаржэння ў Англію. У бліжэйшы час яны змогуць скарыстаць тое, што Ла-Манш будзе акутан імглой, а ночы будуць працягвацца 16 гадзін.

НЬЮ-ЙОРК, 20 снежня. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што ўчора над Лонданам адбыўся жорсткі паветраны бой.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ У АЛБАНІІ

АФІНЫ, 20 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі перадала ўчора наступнае паведамленне: «Баі працягваюцца паспяхова. Праціўнік, не гледзячы на надзвычайна моцнае супраціўленне, быў выбіт з занятых ім пазіцый. Захоплена звыш 600 палонных, многа аўтаматычнага аружжа і іншага ваеннага матэрыялу.

Авіяцыя зрабіла паспяховую бамбардыроўку ваенных аб'ектаў праціўніка».

НЬЮ-ЙОРК, 20 снежня. (ТАСС). Як паведамляе амерыканскі друк, прадстаўнік грэчаскага ўрада заявіў, што італьянцы аставілі ўзбярэжжа заліва Палермо, адступіўшы па напрамку к Хімара. За апошнія 48 гадзін грэкі значна прасунуліся ў сектарах Тэпелене і Клісуры, дзе італьянцы панеслі вялікія страты.

Пасля двухгадзіннага інтэнсіўнага бою грэчаскія войскі занялі Каларат. Маюцца сур'ёзныя страты з абодвух бакоў. Свежыя італьянскія войскі паспяхова супраціўляліся грэкам, якія прадпрынялі ўчора раніцой атакі на поўнач ад Тэпелене. 5 грэчаскіх афіцэраў і 68 салдат забітых, 160—раненых. Прадпрынятая італьянцамі контратака на захад ад Тэпелене была адбіта. Абодва бакі панеслі вялікія страты. У прыбярэжным сектары фронта грэкі адышлі ад галоўнай дарогі, прабуючы акружыць італьянцаў. Апошнія робяць частыя контратакі.

Пазбягаючы франтальных атак, грэкі імкнуцца раскалоць італьянскія сілы.

На левым флангe фронта грэчаскія войскі занялі раён Страдэбіанка ў двух мілях на захад ад Паласа. Моцны агонь італьянскіх кулямётаў, замаскіраваных у раёне ракі Тамарыца, перашкодзіў грэкам авалодаць тут горным склонам. Грэкі адступілі да сваіх папярэдніх пазіцый, панёсшы цяжкія страты. У раёне Грамш, не гледзячы на глыбокі снег, адбываецца бой.

Грэчаскія войскі знаходзяцца ў гарах Дэсніка ў 6 мілях на поўнач ад Клісуры, а таксама на рацэ Бака (прыток ракі Осум). Італьянцы працягваюць канцэнтрыраваць свежыя войскі ў сектары Эльбасан. Левы фланг грэчаскіх войск знаходзіцца ў гарах Малі Спатыт, прыкладна ў 8 мілях ад Эльбасана, а іх правы фланг —у гарах Мокра на заходнім узбярэжжы возера Охрыда.

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАГА ФЛОТА

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Англійскае марское міністэрства паведаміла, што «у ноч на 18 снежня злучэнні лёгкіх і цяжкіх караблёў англійскага міжземнаморскага флота прадпрынялі аперацыі ў Адрыятычным моры з мэтай парушыць марскую сувязь Італіі з Албаніяй. Англійскі крэйсер і эсмінец праніклі ў Адрыятычнае мора аж да Бары і Дурацо. Ні аднаго карабля праціўніка яны не сустрэлі. У гэты-ж час англійскія лінкоры прайшлі праз праліў Отранта і падверглі бамбардыроўцы Валону. На порт было выпушчана многа снарадаў агульнай вагай каля 100 тон. У час гэтых аперацый ніякага супраціўлення праціўнік не аказаў».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ПУСТЫНІ

ЗВОДКА ІТАЛЬЯНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

РЫМ, 20 снежня. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе: У пагранічнай зоне Кірэнаікі наша артылерыя паспяхова абстраляла батарэі і механізіраваныя войскі праціўніка ў сектары Бардзіі. Эскадрыллі англійскіх самалётаў атакавалі нашы паветраныя злучэнні, у той час, калі яны абстрэльвалі з кулямётаў і бамбардыравалі англійскія войскі. У жорсткім баі збіта два англійскіх самалёты. Адзін наш знішчальнік не вярнуўся на сваю базу. У ноч на 19 снежня італьянская авіяцыя бамбардыравала Александрыю.

Ва Ўсходняй Афрыцы адзначаецца актыўнасць патрульных атрадаў і артылерыі на граніцы англа-егіпецкага Судана. 19 снежня італьянская авіяцыя бамбардыравала склады і абарончыя ўмацненні праціўніка ў ваколіцах Метэмы. На грэчаскім фронце ў раёне дзеянняў 11-й арміі працягваюцца жорсткія баі. Учора ўдзень ва многіх пунктах італьянская авіяцыя бамбардыравала скапленні войск праціўніка. У завязаўшымся паветраным баі збіта тры непрыяцельскіх самалёты.

Нашы пікіруючыя бамбардыроўшчыкі патапілі адзін англійскі параход, бамбардыравалі і абстралялі з кулямётаў скапленні механізіраваных войск праціўніка і англійскія транспарты. Днём 18 снежня пры спробе непрыяцеля зрабіць налёт на Валону было збіта тры англійскіх самалёты.

Англійская авіяцыя зрабіла 4 налёты на Брындзізі (Італія). Сярод грамадзянскага насельніцтва лёгка ранена 5 чалавек.

СТАНОВІШЧА Ў РАЁНЕ БАРДЗІІ

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, большая частка двух знаходзячыхся ў Бардзіі італьянскіх дывізій акружана англійскімі войскамі. У гэты раён



бесперапынна прыбываюць на грузавіках англійскія падмацаванні. Мяркуюць, што англійскія перадавыя часці перарэзалі дарогу з Бардзіі на Тобрук.

—o—

СМЕРЦЬ КАЛІО

ХЕЛЬСІНКІ, 19 снежня. (ТАСС). Як паведамляе фінляндскае тэлеграфнае агенцтва, сёння скончыўся ад разрыва сэрца былы фінляндскі прэзідэнт Каліо.



На першым спезе. Вучаніца 4-га класа 15-й школы горада Беластока Геня Шуб на лыжах.

Фото А. Сапіра.

Першы зімовы кінофестываль

Днямі Беластоцкім абласным упраўленнем кінофікацыі была праведзена нарада дырэктараў кінотэатраў вобласці па пытанню абслугоўвання школьнікаў у час набліжаючыхся зімовых канікул.

Ва ўсіх кінотэатрах будзе значна павялічана колькасць дзіцячых кіносеансаў. Падабран ужо спецыяльны дзіцячы рэпертуар. Вучні ўбачаць вядомыя фільмы «Бялее парус адзінокі», «Мы з Кранштадта» і рад іншых. Чакаецца прыбыццё новых дзіцячых фільмаў «Сібіракі», «Цімур і яго каманда», «Вясёлыя артысты».

Асаблівую цікавасць, несумпенна, выклікаюць сярод школьнікаў мультыплікацыйныя фільмы.

У час зімовых канікул у беластоцкім дзіцячым кінотэатры «Чырвоная зорка» гродненскім дзіцячым кінотэатры «Кім» і ломжынскім кінотэатры «Чырвоная зорка» будзе праведзен упершыню ў нашай вобласці зімовы дзіцячы кінофестываль. Весела і радасна навагодняй ёлкай і балам-маскарадам адкрыецца 31 снежня зімовы фестываль.

У праграме фестываля — сустрэчы са знатнымі людзьмі нашай вобласці, дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР, дэпутатам Беластоцкага абласнога Совета і Героем Совецкага Саюза.

У беластоцкім кінотэатры «Чырвоная зорка» у час фестываля будзе наладжана цікавая выстаўка «20 год совецкага кіно». Намечана таксама правядзенне раду масавых мерапрыемстваў, як гутаркі, даклады і т. д.

—o—

СПАБОРНІЦТВЫ ШТАНГІСТАЎ

У гарадах Беларусі зараз праходзяць завочныя рэспубліканскія спаборніцтвы па штанзе. У Беластоку спаборніцтвы адбудуцца 22 снежня. У іх прымуць удзел каля 40 чалавек лепшых штангістаў Беластока і вобласці.

НОВАГОДНЯЯ ЁЛКА НА СОВЕЦКАЙ ПЛОШЧЫ

Новагоднія ёлкі для піянераў і школьнікаў Совецкага Саюза сталі традыцыйнымі святамі. Праз некалькі дзён у школах, на катках, стадыёнах мільёнамі агнёў засвецяцца прыгожыя ёлкі. Шчаслівая дзетвара нашай неабсяжнай радзімы з радасцю будзе сустракаць новы 1941 год.

Беластоцкі гарадскі камітэт комсамола і гарадскі аддзел народнай асветы рашылі арганізаваць вялікую агульнагарадскую новагоднюю ёлку на Совецкай плошчы. Ёлка будзе мець 12 метраў вышыні. Мастацкае ўпрыгожанне ёлкі будзе зроблена лепшымі мастакамі Беластока.

Прыгожае пано, устаноўленае каля ёлкі, будзе паказваць новыя дзіцячыя гульні, карагоды, вясёлыя песенькі, жарты, новагоднія падарункі, ветлівага дзеда-мароза і інш. Плошча будзе ўпрыгожана партрэтамі шырока вядомых і любімых дзецьмі паэтаў і пісьменнікаў — Пушкіна, Крылова, Талстога, Горкага. Пад партрэтамі на палотнах вялікімі літарамі будуць напісаны прыказкі, вершы, казкі, якія вялікія майстры слова напісалі для дзяцей.

Адкрыццё ёлкі адбудзецца вечарам 31 снежня. На працягу ўсяго часу зімовых канікул на Совецкай плошчы сотнямі рознакаляровых агнёў будзе ззяць прыгожая ёлка. Кожны дзень, пачынаючы з 31 снежня гэтага года па 13 студзеня 1941 года, вакол ёлкі будуць арганізоўвацца дзіцячыя карагоды, гульні, атракцыёны. Сіламі лепшых мастацкіх калектываў школьнікаў, артыстамі філармоніі і Дома народнай творчасці тут будзе арганізавана некалькі канцэртаў.

Многа падарункаў рыхтуецца для рэбят, якія будуць удзельнічаць у конкурсе мастацкіх выканаўцаў песень, вершаў, казак і танцаў. У жыцці беластоцкіх піянераў і школьнікаў — гэта першая вялікая, па-сапраўднаму радасная ёлка.

П. Дубровін.

—o—

Напярэдадні пешага комсамольскага пераходу

Комсамольцы і несаюзная моладзь Валкавыскага раёна дзейсна рыхтуюцца да пешага комсамольскага пераходу. У раёне створана 60 каманд, у якія ўваходзяць 600 чалавек. Каманды напалову ўкамплектаваны вучнёўскай і рабочай несаюзнай моладдзю. Штабам па правядзенню пераходу намечаны маршруты.

Комсамольская арганізацыя цэментнага завода «Рось» укамплектавала 5 каманд мужчынскіх і адну жаночую. Рэгулярна праводзяцца трэніроўкі.

Вялікая работа па падрыхтоўцы да пераходу вядзецца ў комсамольскай арганізацыі чыгуначнай міліцыі Валкавыскага чыгуначнага вузла.

Д. Казлоў.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 17-62, адказнага сакратара — 49, аддзелаў прапаганды і партыйнага — 16-10, эканамічнага аддзела — праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя — 14-32.

УБ—136. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку